# † Сьвятой памяці Др. Станіслаў Грынкевіч

Др. Станіслаў Грынкевіч памер 18 красавіка ад разорвы сэрца з прычыны знэрваваньня, на 54 годзе жыцьця. Пахаваны 21 красавіка ў Кліўляндзе на месцкіх могілках. На пахове маліліся, разам із множасьцяй сьвецкіх Вялікаліцьвіноў, два вялікалітоўскія сьвятары: каталіцкі Пранціш Чарняўскі і праваслаўны Аляксандра Крыт. Усі Вялікаліцьвіны Кліўлянду і прыяжджомыя, бяз розьніцы веры, у вялікім смутку з глыбокім жалям разьвіталіся зь Нябошчыкам. Пачуўшы празь непаравую сьмерць Нябошчыка, такім жа пачуцьцём працяліся ўсі тыя Вялікаліцьвіны, што знали Станіслава Грынкевіча.

Сьв. памяці Станіслаў Грынкевіч усё жыцьцё быў сьведамым Вялікаліцьвіном ды дзейным а гарачым патрыётам. Ён горача адгукаўся на ўсі праявы нашага нацыянальнага жыцьця. Быў сябрам Крывіцкага (Вялікалітоўскага) Навуковага Т–ва Пранціша Скарыны і цьвярдым прыхільнікам аднаўленьня нашага нацыянальнага назову „Вялікалітва“. Із сьмерцяй ягонай наш адраджэнскі рух панёс вялікую страту. Будзем маліцца, каб Спадар Бог даў Яму рай нябёсны, а на гэтым сьвеце, каб Ён жыў у сваіх дзяцёх. Пазычма а парупмася, каб яны вырасьлі годнымі свайго Дарагога Айца.

# Як жылося нашым людзём пад ігом маскоўскім

Манлівая прапаганда расійска–бальшавіцкіх русыфікатараў цьвердзе, што быццам у Расіі жыцьцё было лепшае, чымся ў былым незалежным гаспадарстве нашым, Вялікім Княстве Літоўскім, і затым быццам Вялікаліцьвіны–Беларусы імкнуліся задзіночыцца з Расіяй. Прымеж таго было наадварот. Затым, колькі будзе ставаць месца ў нашым малым часапісе, мы будзем зьмяшчаць ведамкі із жыцьця ў Расіі, асабліва із жыцьця нашага народу ў Расіі. Ведамкі будзем браць із жаролаў расійскіх.

Расійскі пісьменьнік (із зрусыфікаваных Беларусаў) Ляскоў, піша:

> Старгорад ажываў перад дабліжэньням вясны: рака зьбіралася пайсьці, сінела й падыймалася; паабапал яе расьлі вялікія груды кулёў із збожжам, і гатавалі вялізныя стругі.
> З галадавалых узімку сёлаў дзень у дзень прыходзілі да местаў груды абарваных мужыкоў у лапцёх і *белых магерках* (падчыркненьне перакладніка). Яны набіваліся ў нашэньнікі цяжараў дзеля адных падаткаў і дзеля хлеба і былі вельма шчасьлівыя, калі іх бралі гнаць да далёкіх краёў тое самае збожжа, каторага не ставала ў іх дома. Але й гэтае шчасьце, ведама, малі ня ўсе. Пасуленьне працы далёка пераходзіла патрабаваньне яе. Праз гэтых лішніх людзёў ніхто не ўважаў сябе за абавязанага рупіцца: нанятыя — іншая справа, празь іх рупіліся. Іх прыпушчалі да ежы пры наглядніках, каторыя адганялі нагаладавалых ад казана, калі яны пад’елі ў меру. Да адвалу нагаладавалым ня можна даваць есьці: гэтыя, як іх завуць, „прагавітнікі“, аб’ядаюцца і мруць ад аб’ядзеньня. Нядаўна два такія галодныя „прагавітнікі“, дужасілы дзяцюкі з Акі, седзячы адзін супроці аднаго ля казана кашы, абодва ўраз пакаціліся й памерлі. Лекар рэзаў трупы і, шукаючы ў трыбусе атруты, знайшоў адну кашу: кашаю напоўнены расьцягнены да немагчымасьці трыбух, кашаю напоўненая была еча, і ў роце і ў глытніцы ўсюдых ляжала ўсё тая самая зьедзеная братамі каша. Грэх гэтае сьмерці ляжаў на наглядніку, каторы не пасьпеў упару адагнаць ад ежы нагаладавалых братоў „прагавітнікаў“. Недагляд быў такі вялікі, што ў другой